Бібліятэка «Вожыка» № 3(225)

Рыгор БАРАДУЛІН

# АСОБЫ РОЗНАЙ ПРОБЫ

ЭПІГРАМЫ

Мастакі: Анатоль ГАРМАЗА,
Мікола ГІРГЕЛЬ

МІНСК — 1994

ВЫДАЕЦЦА 3 МАЯ 1957 ГОДА
ВЫХОДЗІЦЬ 6 РАЗОЎ У ГОД

© «Бібліятэка «Вожыка», 1994

# Рыгор БАРАДУЛІН



Шарж А. ГАРМАЗЫ.

*З Рыгорам Барадуліным не засумуеш. Ён надзвычай вясёлы і «несур'ёзны» чалавек. У тым сэнсе, што ну хоць што хочаш рабі, а не змусіш сур'ёзна ставіцца да надзвычай сур'ёзных асоб — будзь ты прэм'ер, спікер, народны ці проста пісьменнік, артыст, кампазітар, шаноўны бізнесмен ці знакаміты лекар. Ледзь нехта пачынае бранзавець ці даваць прамашкі — тут жа пайшла гуляць барадулінская эпіграма. Не зважаючы і не ўважаючы на званні і рэгаліі. Амаль усе барадулінскія эпіграмы на працягу апошніх двух гадоў з нумара ў нумар друкаваў «Вожык». А зараз «Вожык» сабраў усе разам — і атрымалася...*

*Зрэшты, самі мяркуйце, што атрымалася.*



## Васіль БЫКАЎ



Ён не прарок, бо нам чужы —
Хай Быкаў змоўкне на крыжы.
Сярпом ці молатам з рукі
Гнаць бальшавіцкія цвікі.
Прарокі ёсць у нас —
Яны
Каля крамлёўскае сцяны.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Мітрапаліт Філарэт




Ад сэрца жадаючы многая
лета,
Надзеі ўскладаем
на Філарэта,
Што благаславіць Беларусь
у дарогу
І па-беларуску
Памоліцца Богу.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Стэфанія СТАНЮТА




Не трэба для купалаўцаў валюта,
Пакуль ёсць сцэна,
А на ёй — Станюта.
Курс таленту спадарыні Стэфаніі
Не падае ні пры якой кампаніі.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

## Зянон ПАЗЬНЯК



Да ўлады Пазьняк не хадзіў у залёты,
Ён скібку сабе выбіраў што чарсцвей.
Шкадуе, што ўсе асушылі балоты, —
Куды ж
Камуністаў паслаць да чарцей?!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



## Максім ТАНК



І палітычная гайданка
Не разгайдала канчаткова
Аўтарытэт Максіма Танка.
Стараўся ж небезвынікова
Быць і ў застольныя часы
Паэтам чыстае красы.
І, часу плацячы даніну,
Прыгожую захоўваў міну.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

2 Зак. 516

# Станіслаў ШУШКЕВІЧ




Лягчэй, напэўна, Гімалаі зрыць,
Чым навучыць —
І спікер ведаў гэта, —
На беларускай мове гаварыць
Таварышаў з Вярхоўнага Савета.
Шушкевіч цёпла верыў
Сам сабе,
Што масла згоды з бурбалак саб'е!
Ды збілі з трону бурбалкі самога,
Не ўратавала скіперская тога.

Шарж М. ГІРГЕЛЯ.



# Алесь БЕЛАКОЗ



Калі ў гародзе беларушчыны
Адзін дзядоўнік дружна рос,
Пачаў прапопку Белакоз
Двухроднамоўем не
расхрушчаны.
Сад беларускай мовы ён
Сцярог на плён
Да лепшых дзён.

Шарж М. ГІРГЕЛЯ.

## Вячаслаў КЕБІЧ




Кебіч ведае выдатна,
Як круціць палітбалет,
Як прадаць сувернітэт,
Як бясплатна,
Ды не стратна.
У цэкоўскіх гадаванцаў
Цяга да партыйных танцаў.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



## Іван ШАМЯКІН



Хвалілі партыя і ўрад
І ставілі класічна ў рад.
Ды сціх узнагародны град.
Што ўзяць з літаратурных град?
Як спадзяванне мець на ўрад?
Цяпер Шамякін рад?
Наўрад.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Іван КАРАЦЧЭНЯ



А пачынаць бы скарачэнні
У апараце з Караткэні,
Ды ў Караткэні даручэнне
Ўсеэсэндэўскага значэння.
Таксама, як і ў партыі,
І тут патрэбны ўпартыя!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Пімен ПАНЧАНКА



Адступнікам ды бюракратам
І сватам быў,
І хросным татам:
Хрысціў сатырай,
З ганьбай сватаў,
Ды менш не стала супастатаў.
Хай дождж, хай град, хай перуны —
Яны растуць, як валуны.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Марыя ЗАХАРЭВІЧ



І камісаршаю была,
І членшаю ЦК хадзіла,
Ды беларускага святла
З душы сваёй не разгубіла.
І словам, што збярог Купала,
Сябе Марыя ратавала.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Васіль ШАЛАДОНАЎ



Надзея застаецца нам,
Што зразумее Шаладонаў,
Пра што гаворыць звод законаў,
Пра што гаворыць нам ён сам,
Бо выбіваўся ў грамацеі
Пад кіраўніцтвам Дземянцея.
Ён цвёрда верыць,
Што не сорам
Быць Генеральным пракурорам.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

## Віктар ШМАТАЎ




Не шматаваў нікога Віктар Шматаў,
А толькі заглыбляўся ў даўніну.
Ён думку з беларускім духам сватаў,
Бо знаў русіфікатарам цану.
Мастак, даследчык, знаўца першадрукаў,
Ён першы ў брамку немасці загрукаў.

Шарж М. ПІРГЕЛЯ.



## Генадзь БУРАЎКІН



Кусалі локці ў цішыні
Дзядзькі-цэкоўцы,
Што саслалі
Бураўкіна ў такія далі,
Дый там ён быў на ААНі.
Бураўкін там,
Дзе барацьба.
І, не шкадуючы ілба,
Мур прабівае ён, абы
Ілбу не быць без барацьбы.
Мур апаратны, ён стары,
Глядзіш, і сам ты ўжо ўнутры.

Шарж М. ПІРГЕЛЯ.

## Аляксей МАРАЧКІН




Як бэнээфавец і як мастак
Трымае марку Марачкін заўзяты,
Прафесарска-акадэмічны фрак
Мяняе ён на рыцарскія латы,
Як беларушчыне хто пагражае.
Яму бяда чужая — не чужая!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



## Анатоль БУТЭВІЧ



Сухар без масла есца чэрства,
У дошку цвік не йдзе без груку.
Не можа быць без міністэрства
Ані культуры, ані друку.
А міністэрства без міністра,
Нібы без нечага каністра.
Міністр Бутэвіч, можа, зможа
Знайсці дарогу ў бездарожжа.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Уладзімір ПУЗЫНЯ



Маэстра гоніць прэч нуду.
З зануды выхітрыць дуду,
З былых цэкоўскіх дундукоў
Наробіць для чарцей смыкоў.
Усё пяе ў руках Пузыні,
З ім род крывіцкі не загіне.
Бо без музыкі, без дуды
І думкі ходзяць не туды!

Шарж М. ПІРГЕЛЯ.



# Леанід ШЧАМЯЛЁЎ



І шчамяпюе, як шчамель, штодня,
Бо ўдача — пераборлівая лэдзі.
Як белага не падвядуць каня,
Ён намалюе сам
І сам паедзе.

Шарж А. ГАРМАЗЫ.

# Аляксей ДУДАРАЎ



Убачыў ісціну на дне застою
І быў аблаўрэачаны за тое.
Ці ўбачыцца, нарэшце, Аляксею,
Што з часам
П'еса вострая тупее?

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Юрась ХАДЫКА




Ён не змяняе быка на індыка
І дэмакрата на бальшавіка,
Вучоны і мастацтвалюб Хадыка —
Лірычная апора Пазьняка.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Адам ПАЛЮХОВІЧ




Палюховіч — цёзка пана Сміта —
Раскусіў высновы эканомікі:
Мае той, хто дбае самавіта,
Бо прыбытак не прыносяць гномікі.
І камп'ютэр кемлівы ў «Дайнове»
Думае на беларускай мове.
Хоць ідзе рукой у фірме праца,
Сам Адам не любіць красавацца.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Арлен КАШКУРЭВІЧ



Заўважыў класіку даўно
І класіка яго таксама.
Бо класіка такая дама,
Якой далёка ўсё відно.
Яна і кажа пра Арлена:
Арленна — значыцца
Нятленна!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Іван ЧЫГРЫНАЎ



Прывыкшы ля наменклатуры
Свет белы бачыць кумачова,
Ён узначаліў Фонд культуры,
Як і Раіса Гарбачова.
На Вы заве сябе самога
Чыгрынаў —
Член ЦК былога.
Аж зззяе яйкам велікодным,
Як стаў пісьменнікам народным.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Адам МАЛЬДЗІС



Хто, што сказаў, калі і дзе
Пра Беларусь у цэлым свеце,
У Мальдзіса ўсё на прыкмеце,
Бо ён з мапенства ўлік вядзе.
І ўцёк ад тлуму ці ад дам
У цэнтр Скарынаўскі Адам?

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Заір АЗГУР



Азгур першы блізка ўбачыў мэту,
І стараўся шчыра дабрадзей
Ідаламі партыі планету
Засяліць замест жывых людзей.
Ідалам лягчэй з цяжкой задачай —
Дабудуюць камунізм, няйначай.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Іосіф СЯРЭДЗІЧ



У гневе праведным Сярэдзіч
Сябе самога апярэдзіць.
Пакуль ён вудзіць печкуроў —
Акулы ходзяць — будзь здароў!

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**

# Ядвіга ПАПЛАЎСКАЯ

# і Аляксандр ЦІХАНОВІЧ




Не трэба галодных дыет!
Не толькі душою абновішся,
Калі будзеш слухаць дуэт
Паплаўскай і Ціхановіча.
Ім трэба не горла лудзіць,
А рэпертуар маладзіць.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Сяргей ЗАКОННІКАЎ



Досвіткам выйшаў з ушацкіх сасоннікаў,
К вечару аж да сталіцы дайшоў.
Званняў, пасад паназбіраў Законнікаў, —
Як валуі тыя, лезуць з кашоў.
Дзьмухаць умее паэт —
І ў Сяргея
«Полымя» сэрца чытацкае грэе.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Ігар ЛУЧАНОК



Кіпіць натхненне ў чыгунку.
Вядзецца гаспадарка планава.
І пішуць тэксты Лучанку
Усе —
Ад Лукшы да Лук'янава.
Смакуе менскую сасіску,
А песню чуе па-расійску.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Барыс САЧАНКА



Да арганізму не маючы літасці,
Не мае роўных у пладавітасці.
Крывая поспеху ў прынцыпе простая —
У ступу славы ўсё сып да ма́чынкі.
І скора будуць Пасланні апосталаў
Выходзіць,
Як публікацыі Сачанкі...

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Анатоль ЯРМОЛЕНКА



Анатоля не майце ў легцы,
Не спяшаецца легчы-прылегчы.
Мае голас і нешта здаровае,
Што прысушвае, прычароўвае.
Маладзічкай вясёлай на коленкі
Слава скача сама да Ярмоленкі.

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**



# Васіль ЗУЁНАК



У хамут не б'е, не рве пастронак —
Цягне воз пісьменніцкі Зуёнак.
Падпусціць ахвота авадня,
Каб прымусіць гарцаваць каня!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Віктар РОЎДА



А слава, як тая кароткая коўдра,
Дзе кожны ўпіраецца, моўчкі сапе.
І толькі маэстра пашаністы Роўда
Не тужыўся коўдру цягнуць на сябе.
З улады зямное не ўзносіў нікога.
Як песняй і славіў,
Дык Бога самога.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



# Анатоль КУДРАВЕЦ




Старэюць святы, чэзнуць юбілеі,
Стамляюцца падзеі ад хады.
А Кудравец і «Нёман» не мялеюць —
Відаць, абодвум нельга без вады!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

# Алесь ЖУК




Ён не зважаў на цені літдубоў,
Рос і шукаў «Праклятую любоў».
І класіка гукнула слуцака,
Абнізіла высокія парогі.
Бо ён ад Бога, талент у Жука,
А не з гуманітарнай дапамогі.

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**



# Уладзімір НЯКЛЯЕЎ



Усё Някляеў робіць гладка —
Ад заляцання да радка
І, як ласкавае цялятка,
З «Крыніцы» п'е і з «Родника».
Ды плача ўсё,
Калі глыне:
— Лёс, як віно на палыне.

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**

## Віталь ШЧЭРБА



Віталя свет увесь вітае,
Кахае слава залатая
І любіць ашукаць радзіма.
Адно не ведаюць жлабы —
Украсці можна прыз любы,
Ды ўкрасці талент немагчыма!

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**



## Анатоль ВЯРЦІНСКІ




На поўным імпэце, пры аўтарытэце,
Паэт, аналітык і крытык,
Працуе Вярцінскі ў Вярхоўным Савеце,
Разважлівы ў спрэчках адкрытых.
Па часе дадасць,
Даўшы класікам фору,
Таміны законаў да поўнага збору.

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**

# Ґаўрыіл ВАШЧАНКА



Мастак драмаць не меў падстаў,
Не драў з ідэйнай ліпы лыкаў.
І Чалавекам Года стаў
Лірычны Вашчанка,
Як Быкаў.

Шарж А. ГАРМАЗЫ.



# Станіслаў БАГДАНКЕВІЧ




Станіслаў пярэчыць Станіславу —
Лічыць Багданкевіч, як банкір:
Той не будзе прадаваць
Дзяржаву,
У каго мазгі не набакір!

Шарж М. ГІРГЕЛЯ.

## Міхаіл ФІНБЕРГ



Танцавалі не ад печкі —
Ад ЦК.
Фінберг танцаваў ад ЦырКа
Смела.
Дырыжорскай палачкай рука
І звяроў утаймаваць сумела.
Сёння ўсім вядома без рэкламы:
Фінбергаў аркестр найсамы самы!

**Шарж М. ГІРГЕЛЯ.**



## Святлана ДАНСКАЯ



А магіня можа пад гіпнозам
Памагчы вярнуць цвярозы розум.
Адвучаць Данской не ўпершыню
Ад гарэлкі і ад тытуню.
Ды сягоння трэба метад свежы —
Адвучаць ад ежы і адзежы.

**Шарж А. ГАРМАЗЫ.**

Григорий Иванович БОРОДУЛИН

ПЕРСОНЫ РАЗНОЙ ПРОБЫ

Э п и г р а м м ы

Рыгор Іванавіч БАРАДУЛІН

АСОБЫ РОЗНАЙ ПРОБЫ

Э п і г р а м ы

Рэдактар Нэля ТУЛУПАВА.

Тэхнічны рэдактар Галіна ГЕГО. Карэктар Валянціна ШУСТ.

Здадзена ў набор 26.05.94. Падпісана да друку 10.06.94.
Фармат 70x108[1]/32. Папера друкарская. Часопісна-сечаная гарнітура.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 2,1. Ум. фарб.-адб. 2,0.
Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 11000 экз. Заказ 516. Цана дагаворная.

Адрас рэдакцыі:

220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».

220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.